# БАТАНІЧНАЯ НАМЕНКЛАТУРА Ў ТВОРЧАСЦІ Р. БАРАВІКОВАЙ

К. М. МАСЛАЎ

*УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», Брэст, Беларусь, borsnina@yandex.by*

*Навуковы кіраўнік – Н. М. Борсук, заг. кафедры, к.ф.н.*

**Уводзіны.** Шматлікія батанічныя номены сустракаюцца ў паэзіі Раісы Баравіковай. І гэта невыпадкова. Большасць вершаў паэтэсы маюць фальклорную аснову. Нельга не ўлічваць і той факт, што Р. Баравікова – яскравы прадстаўнік жаночай паэзіі. Значнае месца ў творчасці беларускай паэтэсы займае любоўная лірыка. Лексемы, звязаныя з раслінным светам, у сваю чаргу дапамагаюць творцу раскрыць свет лірычнай гераіні, няпростыя ўзаемаадносіны закаханых. Не абыходзіць увагаю Р. Баравікова вечныя філасофскія пытанні. Дзеля гэтага выкарыстоўвае нязвыклыя для беларускай літаратуры фларыстычныя вобразы. Вышэйакрэсленыя пытанні знаходзяцца ў полі зроку літаратуразнаўцаў, якія спрычыніліся да асэнсавання творчасці Раісы Баравіковай.

**Матэрыялы і метады.** Паэтычныя зборнікі Р. Баравіковай, аналітычны метад.

**Вынікі і абмеркаванне.** Ужо з першага паэтычнага зборніка паэтэсы “Рамонкавы бераг” бачна, што для Р. Баравіковай родны край асацыіруецца з вобразам бярозкі: “з бяляваю бярозкай ля парога” (верш “Не ведаю я, з чым параўнаць”). Даволі традыцыйны вобраз для беларускай літаратуры.

Смелы вобраз язміну, зрокава і псіхалагічна дакладны, хаця і нязвыклы, таксама сімвалізуе родны куточак, але яшчэ і рэчы, дарагія сэрцу, страчаныя з гадамі ў мітусні дзён (верш “Доля”).

Безумоўна, у кожнага чалавека сваё меркаванне пра духоўныя каштоўнасці. Думаецца, з мэтаю раскрыць традыцыі, адметнасці разнастайных куточкаў зямлі творца выкарыстоўвае на старонках паэтычнах зборнікаў вобразы лотаса, пальмы (верш “Чаму?”). Пры выкарыстанні фларыстычных вобразаў паглыбляецца, на наш погляд, адметны жаночы лірычны характар паэзіі Р. Баравіковай. Так пры дапамозе вобраза шыпшыны, якім пачынаецца і завяршаецца верш “Шыпшына пры даліне”, сцвярджаецца маральная прыгажосць асобы. Нягледзячы на няшчаснае каханне, лірычная гераіня захоўвае ў сэрцы пяшчоту, высакародныя адносіны да свайго абранніка.

Загублены лёс маладой жанчыны, якую аддаюць замуж за нялюбага, Р. Баравікова здолела ўвасобіць у вобразе вярбы (верш “Перапляценне гукаў “дж” і “дз””), а месца сустрэч былых закаханых чытач можа прадставіць дзякуючы лексеме “бэз”, якую ўжыла паэтэса ў вершы “Разлуку ў хуткім часе напрароч”.

**Заключэнне.** Як бачна, батанічная наменклатура – гэта цікавы, семантычна разнастайны разрад народнай лексікі, які можа служыць крыніцай папаўнення літаратурнай мовы і батанічнай навуковай наменклатуры. Гэта і своеасаблівая метамова, якая раскрывае духоўнае аблічча паэта.